Упраўленне па адукацыі Маладзечанскага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Палачанская сярэдняя школа Маладзечанскага раёна»

# СТВАРЭННЕ ЭКОЛАГА-КРАЯЗНАЎЧАГА ДАВЕДНІКА

# *“ЗЯЛЁНЫЯ МАРШРУТЫ МАЛАДЗЕЧАНШЧЫНЫ”*

# З ВЫКАРЫСТАННЕМ ІНТЭРНЭТ-РЭСУРСАЎ

**Аўтар:**
***Фалей Павел Аляксеевіч,***
**вучань 10 класа**

**Кіраўнік:**
***Мяцельскі Юрый Міхайлавіч,***
**настаўнік геаграфіі**



fppt.com

# Актуальнасць

- Актуальнасць праблемы даследавання не выклікае сумненняў, так як у апошні час усё большае значэнне надаецца ахове прыродных тэрыторый. Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь зацверджаны «Комплекс мер па развіцці і прасоўванні экалагічнага турызму на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях на перыяд да 2025 года», якім мы кіраваліся.

fppt.com

# Аб’ект, прадмет, прадукт даследавання

- ***Аб’ект даследавання*** - прыродаахоўныя тэрыторыі Маладзечанскага раёна.
  - ***Прадмет даследавання*** - прынцыпы і геаграфія размяшчэння прыродаахоўных тэрыторый Маладзечаншчыны.
  - ***Прадукты даследавання*** – эколага-краязнаўчы даведнік, аўдыягід і інтэрактыўная карта “Зялёныя маршруты Маладзечаншчыны”.

fppt.com

**Мэта:** ***вызначэнне структуры і магчымасцяў выкарыстання прыродаахоўных аб’ектаў Маладзечанскага раёна для стварэнне віртуальнага эколага-краязнаўчага даведніка, які адлюстроўвае асаблівасці размяшчэння і развіцця экалагічнага турызму ў рэгіёне***.

- ***Задачы:***
- прааналізаваць літаратурныя крыніцы па тэме даследавання, вывучыць праблему і вызначыць метады даследавання;
- вызначыць узровень экалагічнай культуры грамадства;
- скласці картасхему прыродаахоўных аб’ектаў і распрацаваць маршруты эколага-краязнаўчых экскурсій;
- стварыць аўдыягід экскурсійнага маршруту ў мабільным дадатку izi.TRAVEL;
- распрацаваць стацыянарныя і віртуальныя квэсты па маршруце экскурсіі, віртуальную гульню “Кола фартуны: “Прыродная спадчына Маладзечаншчыны”;
- размясціць прадукт даследавання на краязнаўчым сайце “Polochany-City” для шырокага кола наведвальнікаў;
- далучаць экскурсантаў да актыўнай прыродаахоўнай дзейнасці.

fppt.com

- ***Гіпотэза:*** калі ёсць магчымасць прывесці ў сістэму увесь сабраны матэрыял, то вынікам стане гатовы Экатурыстычны прадукт, які змяшчае поўную інфармацыю пра асаблівасці размяшчэння і развіцця ахоўных прыродных тэрыторый Маладзечаншчыны.
- ***Метады даследавання:***
- навуковага пазнання (назіранне за аб’ектамі, фатаграфаванне выбраных аб’ектаў);
- навукова-даследчыя (праца з навукова-папулярнай літаратурай, статыстычнымі і картаграфічнымі даведнікамі);
- вуснагістарычны (інтэрв’ю);
- сацыялагічны (анкетаванне);
- камп’ютарныя тэхналогіі

fppt.com

# Этапы даследавання

| Назва этапу | Змест этапу |
| --- | --- |
| **Падрыхтоўчы** | 1. Вывучэнне літаратуры па тэме праекта.<br>2. Складанне анкеты "Экалагічны турызм у маім уяўленні". Апрацоўка і аналіз вынікаў анкетавання.<br>3. Фарміраванне творчых груп па накірунках дзейнасці. |
| **Асноўны** | 1. Вызначэнне асабліва значных прыродных аб’ектаў і ўключэнне іх ў экскурсійны маршрут.<br>2. Складанне маршруту з улікам размяшчэння аб'ектаў эколага-краязнаўчага даведніка.<br>3. Картаграфічнае афармленне маршруту.<br>4. Стварэнне прэзентацыі экскурсіі, размяшчэнне яе на краязнаўчым сайце “Polochany-City”.<br>5. Стварэнне аўдыягіда па экскурсійным маршруце і размяшчэнне яго ў мабільным дадатку izi.TRAVEL.<br>6. Распрацоўка стацыянарнай квэст-гульні “Родныя краявіды”. |
| **Рэалізацыйны** | 1. Арганізацыя і правядзенне экскурсій па распрацаваным эколага-краязнаўчым маршруце.<br>2. Афармленне інфармацыйных матэрыялаў: даведніка, буклетаў. |
| **Заключны** | 1. Аналіз вынікаў работы па ўкараненні праекта “Зялёныя маршруты Маладзечаншчыны” у вучэбна-выхаваўчы працэс установ адукацыі раёна.<br>2. Папулярызацыя эколага-краязнаўчага маршруту Маладзечаншчыны праз школьны сайт, сродкі масавай інфармацыі. |

# Літаратура


1. Ананич, Ю.В. Реализация потенциала территории в создании зеленого маршрута (на примере Мостовского района Гродненской области) / Ю.В. Ананич, О.И. Жебит, А.Е. Яротов, Е.А. Козлов // Научные исследования в современном мире [Электронный ресурс] : материаллы междунар. науч.-практ. конф. 30 окт. 2015 г. под общей редакцией Д.А. Ефремова. – Нефтекамск : НИЦ «Наука и образование», 2015. – С. 7-18.

2. Клицунова, В.А. [и др.]. Рекомендации по открытию и эксплуатации зеленых маршрутов / В.А. Клицунова, Д.Г. Решетников, Н.В. Гагина, А.Е. Яротов. – Минск : Изд-во «Ковчег», 2010. – 128 с.

3. Клицунова, В.А. [и др.]. Реализация потенциала территории в создании Зеленого маршрута / В.А. Клицунова, Н.М. Борисенко, Я.И. Аношко. – Минск : Изд-во «Тесей», 2010. – 140 с.

4. Комплекс мер по развитию и продвижению экологического туризма на особо охраняемых природных территориях на период до 2025 года, № 06/214-33/94. – Минск, 2017.

5. Красная книга Республики Беларусь. Растения : редкие и находящиеся под угрозой исчезновения виды дикорастущих растений / И.М. Качановский и др. – 4-е изд. – Минск. : Беларус.Энцыкл.імя П.Броўкі, 2015. – 448 с.

6. Маладзечанскі раён: ілюстрацыйнае выданне / укладальнік М.М. Казлоўскі. – Мінск : “Беларусь”, 2015. – 245 с.

7. Пасанен, В.Э. Вертикальная Беларусь : справочник-путеводитель по 125 уникальным и самобытным туристско-экскурсионным объектам Беларуси / В.Э. Пасанен, Е.А. Дикусар, В.Е. Подлисских. – Минск : Право и экономика, 2013. – 164 с.


fppt.com

# Фізічная карта раёна




# Глебава-раслінная карта




fppt.com

# Вынікі анкетавання

## Пераважаючыя віды турызму сярод рэспандэнтаў, %




## Прыродаахоўныя аб’екты, якія б хацелі наведаць рэспандэнты




fppt.com

# Прыродная спадчына Маладзечаншчыны

- ***На тэрыторыі Маладзечаншчыны налічваецца 22 аб’екты, якія маюць статус прыродаахоўных.***
- ***1 помнік прыроды рэспубліканскага значэння;***
- ***4 заказнікі мясцовага значэння;***
- ***10 батанічных помнікаў прыроды мясцовага значэння;***
- ***2 гідралагічныя помнікі прыроды мясцовага значэння;***
- ***5 геалагічных помнікаў прыроды мясцовага значэння;***
- ***арэалы сустракальнасці рэдкіх відаў раслін, якія занесены ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.***

fppt.com

# Эколага-краязнаўчы даведнік



**Гідралагічны помнік прыроды “Крыніца Багдановіча”**

Гідралагічны помнік прыроды мясцовага значэння “Крыніца Багдановіча” размешчаны на ўскрайку в. Ракцёўшчына на тэрыторыі філіяла Літаратурнага музея Максіма Багдановіча. Ахоўная тэрыторыя, знаходзіцца на левым беразе безымяннага ручая. Яе плошча складае 0,13 га. У склад помніка прыроды ўвайшлі землі філіяла літаратурнага музея Максіма Багдановіча. Гідралагічны помнік прыроды мясцовага значэння “Крыніца Багдановіча” створаны для захавання культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа.

Крыніца з'яўляецца часткай гістарычнага ландшафту, з якім звязана жыццё і творчасць вялікага беларускага паэта М. Багдановіча. Крыніца характарызуецца чысцінёй сваіх вод, пастаянным дэбітам. Сваю назву помнік прыроды атрымаў ад прозвішча паэта.

Штогод у фальварку праводзіцца літаратурна-музычнае свята “Ракуцёўскае лета”, куды традыцыйна наведваюцца паэты, музыканты, мастакі з розных куткоў Беларусі, гучаць беларускія песні, вершы.

fppt.com

# Карта ААПТ




fppt.com

# Картасхема маршруту




fppt.com

# Падарожжа з аўдыягідам на izi.Travel




fppt.com

# Квэст «Родныя краявіды»

Заданне: Выкарыстоўваючы QR-код, назавіце гэтую прыгожую птушку. Знайдзіце на тэрыторыі парка месца, дзе яе можна сустрэць. Адказ упішыце ў маршрутны ліст. Адзначце гэтае месца лічбай 6 у кружочку на карце маршрута.



fppt.com

# Краязнаўчыя маршруты

***Пешыя паходы выхаднога дня:***

- аг. Палачаны (школа) – батанічны помнік прыроды “Парк Яхімоўшчына” – урочышча Дуброўка;
- аг. Палачаны (школа) – батанічны помнік прыроды “Парк Беразінскае” – гара “Курган”;
- аг. Палачаны (школа) – батанічны помнік прыроды “Лістоўніца еўрапейская”.

***Пешыя (веласіпедныя) адна- і двухдзённыя паходы:***

- аг. Палачаны (школа) – батанічны помнік прыроды “Парк Беразінскае” – гара “Курган” – гара “Маяк” – батанічны помнік прыроды “Польскія культуры лістоўніцы еўрапейскай” – батанічны помнік прыроды “Вяз гладкі”;
- аг. Палачаны (школа) – гідралагічны помнік прыроды “Крыніца Лешна” – батанічны помнік прыроды “Парк Маліноўшчына” – геалагічны помнік прыроды “Слабодкаўская выдма”;
- аг. Палачаны – дэндрапарк “Верадова” – біялагічны заказнік “Сасна Веймутава” – водна-балотны заказнік “Чысць” – гідралагічны помнік прыроды “Крыніца Багдановіча”.

***Камбініраваныя паходы, тэматычныя экскурсіі:***

- “Ландшафтны заказнік “Бортнікі”, “Дэндрапарк “Верадова”, “Купалаўскі мемарыяльны запаведнік “Вязынка”.

fppt.com

# polochany.jimdo.com




fppt.com

# Прыродаахоўныя аб’екты Маладзечаншчыны




1. Гідралагічны заказнік «Рака Вязынка»
2. Ландшафтны заказнік «Бортнікі»
3. Дэндрапарк «Верадова»
4. Біялагічны заказнік «Сасна Веймутава»
5. Водна-балотны заказнік «Чысць»
6. Помнік прыроды «Крыніца Багдановіча»
7. Помнік прыроды «Крыніца Лешна»
8. Батанічны помнік прыроды «Лістоўніца еўрапейская»
9. Батанічны помнік прыроды «Польскія культуры лістоўніцы еўрапейскай».
10. Батанічны помнік прыроды «Вяз гладкі».
11. Батанічны помнік прыроды «Лясныя культуры з удзелам піхты белай»
12. Парк прыроды «Маліноўшчына»
13 Парк прыроды «Беразінскае»
14. Парк прыроды «Яхімоўшчына»

Геалагічныя помнікі прыроды

15. Шведская гара
16. Гара Капланшчына
17. Гара  Курган
18. Гара Маяк
19. Слабодкаўская выдма

Расліны Чырвонай Кнігі РБ

20. Шпажнік чарапіцавы
21. Лілея кучараватая
22. Баранец звычайны
23. Пылкагалоўнік даўгалісты
24. Купальнік горны
25. Сон лугавы

# Помнік прыроды рэспубліканскага значэння «Вяз гладкі».

230-гадовае дрэва, з вышыні якога ў яснае надвор'е бачны Маладзечна, Вілейка і Смаргонь, прызнана навукоўцамі найстарэйшым прадстаўніком гэтай пароды ў Беларусі. Вышыня старажыла – звыш 25 метраў, абхват ствала – амаль 7 метраў. Расце помнік прыроды ў вёсцы Талуі Маркаўскага сельсавета каля невялікага вадаёма. У 2018 г, каштоўнасць вяза, як прыроднага аб'екта, вызначылі спецыялісты Інстытута эксперыментальнай батанікі і прыйшлі да высновы, што старажылу каля 230 гадоў.

Ад 26 красавіка 2021 года стары вяз у вёсцы Талуі Маркаўскага сельсавета афіцыйна лічыцца батанічным помнікам прыроды рэспубліканскага значэння.



# Кола фартуны




Вынікі

Выхад

3

# *Першы і пакуль адзіны водна-балотны заказнік на Маладзечаншчыне. Назавіце яго.*



Заказнік «Чысць»

Адказ

Прадоўжыць гульню

Выхад

# Для праходжання квэста неабходна:

- згенераваць QR-код квэста з iziTrawel;
- загрузіць на смартфон дадатак Fake GPS і зайсці ў меню рэжыма распрацоўшчыка;
- рухацца ад кантрольнага пункта згодна інструкцыі аўдыгіда;
- пачуць сігнал GPS-навігатара;
- знайсці аб'ект і атрымаць 20 балаў;
- адказаць на пытанне квэста і атрымаць яшчэ +50 балаў (за правільны адказ);
- зайсці ў «Каментарый» і па геаграфічных каардынатах рухацца да наступнага аб'екта.
- **Максімальная колькасць балаў за квэст - 1610**



fppt.com

# Вывады

- распрацаваны новыя формы і метады работы з вучнямі ў пазаўрочны час;
- уключэнне вучняў у школьную турысцка-краязнаўчую, эколага-асветніцкую і прыродаахоўную дзейнасць;
- распрацаваны і ўкаранёны ў адукацыйны і выхаваўчы працэс віртуальныя экскурсіі з аўдыягідам, квэст-віктарыны;
- віртуальныя экскурсіі стануць даступнымі для людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі.

fppt.com

# Перспектывы работы па праблеме даследавання

- падрыхтаваць рэкламна-інфармацыйныя матэрыялы, прысвечаныя дадзенай тэматыцы і сумесна з раённай інспекцыяй прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя размясціць іх каля прыродаахоўных аб’ектаў (там, дзе яны адсутнічаюць);
- стварыць электронны прыродаахоўны атлас Маладзечанскага раёна па прапанове раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

fppt.com

Упраўленне па адукацыі Маладзечанскага райвыканкама
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Палачанская сярэдняя школа Маладзечанскага раёна»

# СТВАРЭННЕ ЭКОЛАГА-КРАЯЗНАЎЧАГА ДАВЕДНІКА

# ***“ЗЯЛЁНЫЯ МАРШРУТЫ МАЛАДЗЕЧАНШЧЫНЫ”***

# З ВЫКАРЫСТАННЕМ ІНТЭРНЭТ-РЭСУРСАЎ

**Аўтар:**
***Фалей Павел Аляксеевіч,***
**вучань 10 класа**

**Кіраўнік:**
***Мяцельскі Юрый Міхайлавіч,***
**настаўнік геаграфіі**



fppt.com